ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

НЯДЗЕЛЯ, 11 ВЕРАСНЯ 1938 г. № 50 (392)

ЦАНА 20 КАП.

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

Орган праўлення Саюза савецкіх пісьменнікаў БССР і Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР

ГЛЫБОКА ВЫВУЧАЦЬ ГІСТОРЫЮ ПАРТЫІ ЛЕНІНА—СТАЛІНА

Сёння «Праўда» пачынае публікаваць кароткі курс гісторыі Усесаюзнай комуністычнай партыі (большэвікоў). З'яўленне ў свет гэтай выдатнай работы, ухваленай ЦК ВКП(б), з'яўляецца буйнейшай падзеяй у ідэйным жыцці партыі, падзеяй, каласальнае значэнне якой цяжка нават адразу ацаніць. У рэзультаце велізарнай тэарэтычнай работы, праробленай камісіяй ЦК ВКП(б), асабіста таварышам Сталіным, — наша партыя, комсамол, усе працоўныя атрымалі навуковую працу, запечатлеўшую з усёй глыбінёй слаўную гісторыю барацьбы і перамог партыі Леніна—Сталіна.

Публікуемы кароткі курс гісторыі ВКП(б) не з'яўляецца падручнікам звычайнага тыпу. Пры выключна простай, даступнай і яркай форме ізлажэння кніга насычана, пранізана глыбокім **тэарэтычным зместам.** Мінулыя, нездавальняючыя падручнікі па гісторыі ВКП(б) звычайна выглядалі «не як гісторыя, а як лёгкае і незразумелае апавяданне аб справах мінуўшых» (Сталін). Яны не давалі марксісцкага тлумачэння падзеям і фактам з гісторыі партыі, а таму і не адпавядалі асноўнай задачы: дапамагчы партыйным кадрам авалодаць большэвізмам.

Зусім інакш пабудаваны публікуемы кароткі курс гісторыі ВКП(б). Тут тэарэтычна абагулен увесь гіганцкі гістарычны вопыт большэвіцкай партыі, дано сапраўднае навуковае, марксісцкае тлумачэнне складанейшых пытанняў гісторыі рэволюцыйнай барацьбы рабочага класа, гісторыі яго партыі.

З класічнай сталінскай глыбінёй, чоткасцю і яснасцю кароткі курс гісторыі ВКП(б) раскрывае тое **новае,** што ўнёс геній Леніна ў скарбніцу марксізма. Аналіз эпохальных ленінскіх твораў «Что такое друзья народа», «Что делать?», «Шаг вперед, два шага назад», «Две тактики социал-демократии в демократической революции» і іншых работ Уладзіміра Ільіча паказвае, як выкоўвалася Леніным непераможная ідэйная зброя большэвізма. Чытач пры азнаямленні ўжо з першымі раздзеламі гісторыі ВКП(б) бачыць, як ствараліся Леніным **ідэалагічныя** асновы марксісцкай партыі ў Расіі, як складваліся **арганізацыйныя і тактычныя** асновы партыі новага тыпу — партыі большэвікоў, як адстаяў Ленін ва ўпартай барацьбе супроць апартуністаў **тэарэтычныя** асновы марксісцкай партыі. З вычарпальнай паўнатой і глыбінёй ізложана ў кароткім курсе гісторыі ВКП(б) ленінска-сталінскае вучэнне **аб партыі.**

Аналіз геніяльных работ Леніна, як і іншыя тэарэтычныя моманты кароткага курсу гісторыі ВКП(б), з'яўляецца каштоўнейшым укладам у ідэйную скарбніцу большэвізма.

Большэвікі, партыйныя і непартыйныя, вывучаючы гэту кнігу, убачаць неацэнімае багацце тэарэтычнай мыслі, якое змяшчаецца ў кароткім курсе гісторыі ВКП(б). Доўг кожнага большэвіка, партыйнага і непартыйнага, прыступіць да сур'ёзнага, уважлівага, настойлівага **вывучэння** кароткага курсу гісторыі ВКП(б), які з'яўляецца незамянімым кіраўніцтвам па авалоданню большэвізмам.

«ВКП(б), — чытаем ва «Ўводзінах», — расла і мацнела ў прынцыповай барацьбе з дробнабуржуазнымі партыямі ўнутры рабочага руху — эсэрамі (а яшчэ раней з іх папярэднікамі — народнікамі), меншавікамі, анархістамі, буржуазнымі нацыяналістамі ўсіх масцей, а ўнутры партыі — з меншавіцкімі, апартуністычнымі плынямі, — трацкістамі, бухарынцамі, нацыянал-ухілістамі і іншымі антыленінскімі групамі.

ВКП(б) мацнела і загартоўвалася ў рэволюцыйнай барацьбе з усімі ворагамі рабочага класа, з усімі ворагамі працоўных — памешчыкамі, капіталістамі, кулакамі, шкоднікамі, шпіёнамі, з усімі наёмнікамі капіталістычнага акружэння.

Гісторыя ВКП(б) ёсць гісторыя трох рэволюцый: буржуазна-дэмакратычнай рэволюцыі 1905 года, буржуазна-дэмакратычнай рэволюцыі ў лютым 1917 года і соцыялістычнай рэволюцыі ў кастрычніку 1917 года.

Гісторыя ВКП(б) ёсць гісторыя звяржэння царызма, звяржэння ўлады памешчыкаў і капіталістаў, гісторыя разгрому замежнай узброенай інтэрвенцыі ў час грамадзянскай вайны, гісторыя пабудовы савецкай дзяржавы і соцыялістычнага грамадства ў нашай краіне.

Вывучэнне гісторыі ВКП(б) узбагачае вопытам барацьбы рабочых і сялян нашай краіны за соцыялізм.

Вывучэнне гісторыі ВКП(б), вывучэнне гісторыі барацьбы нашай партыі з усімі ворагамі марксізма-ленінізма, з усімі ворагамі працоўных дапамагае **авалодваць большэвізмам,** павышаць палітычную пільнасць.

Вывучэнне гераічнай гісторыі большэвіцкай партыі ўзбройвае веданнем законаў грамадскага развіцця і палітычнай барацьбы, веданнем рухаючых сіл рэволюцыі.

Вывучэнне гісторыі ВКП(б) умацоўвае ўпэўненасць у канчатковай перамозе вялікай справы партыі Леніна—Сталіна, перамозе комунізма ва ўсім свеце».

Большэвіцкая партыя, яе правадыры—Ленін і Сталін заўсёды надавалі найважнейшае значэнне **рэволюцыйнай тэорыі.** Рэволюцыйная тэорыя ёсць вопыт рабочага руху ўсіх краін, узяты ў яго агульным выглядзе. У большэвіцкай партыі, з самага пачатку яе зараджэння, тэорыя заўсёды была неразрыўна звязана з рэволюцыйнай практыкай, слова ў большэвікоў ніколі не разыходзілася са справай.

«...Тэорыя робіцца беспрадметнай, калі яна не звязваецца з рэволюцыйнай практыкай, таксама, як і практыка робіцца сляпой, калі яна не асвятляе сабе дарогу рэволюцыйнай тэорыяй. Але тэорыя можа ператварыцца ў найвялікшую сілу рабочага руху, калі яна складваецца ў неразрыўнай сувязі з рэволюцыйнай практыкай, бо яна, і толькі яна, можа даць руху ўпэўненасць, сілу арыентыроўкі і разуменне ўнутранай сувязі акружаючых падзей, бо яна, і толькі яна, можа дапамагчы практыцы зразумець не толькі тое, як і куды рухаюцца класы ў сучасным, але і тое, як і куды павінны рушыць яны ў бліжэйшым будучым» (Сталін).

Статут Усесаюзнай комуністычнай партыі (большэвікоў) патрабуе таму ад кожнага члена партыі—«нястомна працаваць над павышэннем сваёй ідэйнай узброенасці, над засваеннем асноў марксізма-ленінізма, важнейшых палітычных і арганізацыйных рашэнняў партыі і растлумачваць іх беспартыйным масам».

У нашай краіне збыліся, апраўдаліся геніяльныя словы Маркса аб тым, што «тэорыя робіцца матэрыяльнай сілай, як толькі яна авалодвае масамі». Захопленыя вялікай ленінска-сталінскай ідэяй магчымасці перамогі соцыялізма ў нашай краіне, працоўныя масы СССР пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна сваёй гераічнай творчай працай пабудавалі ўжо ў асноўным соцыялістычнае грамадства.

Але наша барацьба далёка яшчэ не скончана. Нам прадстаяць рашаючыя баі за **канчатковую** перамогу соцыялізма, супроць капіталістычнага акружэння, у першую чаргу, супроць фашысцкіх падпальшчыкаў вайны. Барацьба большэвіцкай партыі, перадавога атрада працоўных СССР, за ўмацаванне і развіццё соцыялістычнага ладу, за канчатковае прэадаленне перажыткаў капіталізма ў эканоміцы і ў свядомасці людзей яшчэ не закончана. Перад намі стаіць гіганцкая і працяглая задача паступовага ператварэння соцыялістычнага грамадства ў комуністычнае, дасягненне вышэйшай фазы комунізма, калі будзе ажыццёўлен прынцып: «Ад кожнага—па яго здольнасцях, кожнаму—па яго патрэбнасцях».

Каб паспяхова змагацца за выкананне гэтых вялікіх задач, усе большэвікі, партыйныя і непартыйныя, павінны нястомна павышаць сваю ідэйную ўзброенасць.

І, у першую чаргу, зразумела, гэта адносіцца да партыйных кадраў. Вядома, што тэарэтычная падрыхтоўка нашых партыйных кадраў слабая. Слабай палітычнай падрыхтоўкай, слабай большэвіцкай загартоўкай, палітычнай бесклапотнасцю карысталіся замаскіраваныя ворагі народа, трацкісцка-бухарынскія і іншыя двурушнікі. Неабходна, нарэшце, пачаць ліквідацыю тэарэтычнай слабасці нашых партыйных кадраў.

Цяпер, калі створана такая магутная ідэйная зброя, як кароткі курс гісторыі ВКП(б), адобраны Цэнтральным Камітэтам партыі, ёсць усе магчымасці быстра рушыць наперад справу марксісцка-ленінскай ідэйнай загартоўкі партыйных кадраў і ўсёй партыі.

Кароткі курс гісторыі ВКП(б) павінен быць пастаўлен у цэнтры ўсёй нашай работы па партыйнай асвеце! Яго павінен вывучыць і засвоіць кожны партыйны актывіст, павінен вывучыць кожны член партыі, кожны комсамолец. Несумненна, што і шырокія масы беспартыйных працоўных абнаружаць жывую цікавасць да гісторыі роднай і блізкай ім большэвіцкай партыі, якая прывяла працоўных СССР да перамогі соцыялізма.

Выхад у свет сапраўды навуковай гісторыі ВКП(б) з'яўляецца падзеяй сусветнага значэння. Нашы браты і таварышы за рубяжом будуць вывучаць гэту кнігу, як абагульненне гіганцкага гістарычнага вопыту ВКП(б), як кіраўніцтва да рэволюцыйнага дзеяння.

Забяспечыць вывучэнне курса гісторыі ВКП(б)—важнейшая задача ўсіх партыйных арганізацый. Трэба азнаёміць **усіх** комуністаў з гэтай выдатнай кнігай і пачаць яе сур'ёзнае, уважлівае, глыбокае вывучэнне.

Перадавы артыкул «Правды» ад 9 верасня 1938 г.



На асенніх тактычных вучэннях часцей Маскоўскай ваеннай акругі. НА ЗДЫМКУ (злева направа): Народны камісар абароны маршал Савецкага Саюза К. Е. ВАРАШЫЛАЎ, камдыў САКАЛОЎСКІ і камандуючы войскамі МВА маршал Савецкага Саюза С. М. БУДЗЕННЫ разглядаюць карту вучэнняў.
Фото В. Федотава (СФ).

СВЯТА ШЧАСЛІВАГА ПЛЕМЕНІ

ДЭМАНСТРАЦЫЯ ПРАЦОЎНЫХ МАСКВЫ Ў ГОНАР XXIV МІЖНАРОДНАГА ЮНАЦКАГА ДНЯ

Масква яшчэ напярэдадні адзелася, як і ўся краіна, у святочнае ўбранне ярка-чырвоных сцягаў, плакатаў, лозунгаў. А з раніцы вуліцы напоўніліся святочным ажыўленнем, іх затапілі жывыя патокі юнакоў і дзяўчат. Многалюдныя калоны ішлі на Красную плошчу, куды ў кожнае свята совецкі народ нясе сваю радасць, свае песні, сваю гордасць, бязмежную любоў і адданасць вялікай партыі большэвікоў, роднаму Сталіну.

Дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР, Вярхоўнага Совета РСФСР, знатныя стаханаўцы і ўдарнікі маскоўскіх прадпрыемстваў, камандзіры Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота, Героі Совецкага Саюза, дзеячы навукі і тэхнікі, майстры літаратуры і мастацтва задоўга да пачатку дэманстрацыі пачалі запаўняць трыбуны ўздоўж Крэмлёўскай сцяны.

Поўдзень. На трыбуне маўзалея—таварышы Угараў, Дзімітраў, Шкіратаў, Косараў, Булганін, Швернік, Героі Совецкага Саюза тт. Папанін, Чкалаў і Белякоў.

Ледзь ва ўрачыстай цішыні сціх дванаццаты ўдар гадзінніка Спаскай вежы Крэмля, як на Красную плошчу ўступілі першыя калоны дэманстрантаў, узначальваемыя шматлікімі сцяганосцамі. Маладыя, моцныя рукі высока ўзнімаюць партрэты Маркса, Энгельса, Леніна, Сталіна, кіраўнікоў партыі і ўрада.

Сотні плакатаў расказваюць аб шчасці маладога сталінскага племені, якому забяспечаны непахісныя правы на працу, на адпачынак, на асвету. Да творца самай дэмакратычнай на свеце Канстытуцыі зварачаюць юнакі і дзяўчаты лікуючыя воклічы:

— Няхай жыве родны Сталін! Ура—вялікаму Сталіну!

У першых радах калоны Кіеўскага раёна ідуць школьнікі. Вясёлая дзетвара ветліва махае букетамі кветак, нясе макеты глобусаў, падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў. Школьнікі высока ўзнімаюць транспарант, на якім напісана іх абавязацельства на новы вучэбны год: «Абяцаем таварышу Сталіну вучыцца на выдатна!» Юныя авіямадэлісты высока ўзнімаюць мадэлі планераў і самалётаў. У беласнежных матросках крочаць юныя асводаўцы. У шлемах ідуць юныя варашылаўскія стралкі. Плячом к плячу з імі ў суседняй калоне праходзяць вучні спецыяльных школ — будучыя чырвоныя артылерысты.

З трохколерным сцягам рэспубліканскай Іспаніі ідзе атрад іспанскіх піонераў, чые бацькі і мацеры, браты і сёстры гераічна змагаюцца з міжнародным фашызмам.

Над плошчаю калышуцца сотні плакатаў і лозунгаў, прысвечаных гераічнай моладзі Іспаніі і Кітая. Вось нясуць плакат — малады баец рэспубліканскай арміі пратыкае штыхом фашысцкую гадзіну. Гучна разносяцца словы гарачага прывітання байцам Іспаніі і Кітая.

Выхаваная Леніным і Сталіным совецкая моладзь выказвае сваю брацкую салідарнасць з мільёнамі юнакоў і дзяўчат, якія гераічна змагаюцца на Захадзе і Усходзе супроць фашызма, за сваю свабоду, незалежнасць, за светлую будучыню ўсяго працоўнага чалавецтва.

Зоркім чэкістам прысвечаны шматлікія плакаты. Лозунгі заклікаюць моладзь да нязменнай большэвіцкай пільнасці, да нястомнага выкрыцця і знішчэння ворагаў народа.

Маладыя совецкія патрыёты нясуць над калонамі сотні транспарантаў і лозунгаў, нагадваючых аб свяшчэнным абавязку кожнага грамадзяніна СССР абараняць сваю прыгожую соцыялістычную радзіму. Маляўнічыя плакаты і пано паказваюць, як жорстка паплацілася японская ваеншчына, якая прабавала ступіць на недатыкальную совецкую зямлю.

Лозунгі славяць мужных совецкіх лётчыкаў, слаўных сталінскіх сокалаў, танкістаў, артылерыстаў, клічуць моладзь на самалёты, на танкі, на ваенныя караблі, у артылерыю.

У радах дэманстрантаў нямала прызыўнікоў — маладых совецкіх патрыётаў, раўеснікаў Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі. Яны дэманструюць сёння сваю гатоўнасць прыняць баявую зброю і пільна ахоўваць свяшчэнную зямлю краіны соцыялізма. Сярод прызыўнікоў многа снайпераў — майстроў меткага агню, варашылаўскіх кавалерыстаў, парашутыстаў, падрыхтаваных арганізацыямі Асоавіяхіма.

... Разам з моладдзю ішлі дарослыя рабочыя, работніцы і служачыя, ішлі школьнікі і піонеры. Бацькі, мацеры, браты, сёстры неслі на плячах і высока падымалі над калонамі малышоў-акцябрат. Звязаны вузамі кроўнага адзінства, совецкі народ у XXIV Міжнародны юнацкі дзень выражаў гэтай маніфестацыяй сваю несакрушальную магутнасць, сілу маладосці і радасць шчаслівага жыцця.

... 2 гадзіны 10 мінут дня Красную плошчу пакідаюць апошнія калоны дэманстрантаў.

У дэманстрацыі прымала ўдзел каля мільёна працоўных сталіцы.

ТЭАТРАЛЬНЫ СЕЗОН

Партыя і совецкі ўрад аказваюць велізарную ўвагу росквіту мастацтва, нацыянальнага па форме і соцыялістычнага па свайму зместу. Пад кіраўніцтвам КП(б)Б вырасла беларускае мастацтва совецкага народа. Выхаваны таленавітыя мастацкія кадры.

Ва ўсіх беларускіх тэатрах паднялася заслона і пачаўся новы тэатральны сезон. Акторы і рэжысёры, мастакі і кампазітары з вялікім натхненнем пачалі працу над стварэннем новых сцэнічных твораў для найлепшага на свеце совецкага гледача. Велізарная сіла совецкага мастацтва ў яго штодзеннай сувязі з найшырэйшымі народнымі масамі, у тым, што яно чэрпае сілы ў найбагацейшай крыніцы, якою з'яўляюцца народныя таленты, што квітнеюць у сонечнай соцыялістычнай краіне.

У той час, як фашысцкія мракабесы знішчаюць найкаштоўнейшыя помнікі культуры і мастацтва, творы найбольш таленавітых паэтаў і драматургаў, мастакоў і кампазітараў, совецкае мастацтва год ад года ўзбагачаецца новымі высокаідэйнымі мастацкімі творамі, якія адлюстроўваюць цудоўнае жыццё народаў нашай радзімы, услаўляюць правадыроў партыі і народа, якія забяспечылі народу нашай краіны шчаслівае, раднаснае жыццё.

Што характэрна для мінулага тэатральнага сезона? Тэатральны сезон мінулага года пачаўся напярэдадні гістарычнай гадавіны—дваццацігоддзя Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі. Лепшыя совецкія драматургі, разам з вядучымі тэатрамі краіны Советаў, стварылі патрасаючыя па свайму драматызму, вялікай ідэйнай глыбіні спектаклі. Драматург Н. Пагодзін разам з тэатрам імя Вахтангава стварыў хвалюючы, манументальны спектакль «Чалавек з ружжом», дзе паказан вобраз вялікага генія пролетарскай рэволюцыі В. І. Леніна. Дэпутат Вярхоўнага Совета Саюза ССР драматург А. Карнейчук—сын вялікага украінскага народа—у сваёй п'есе «Праўда» натхнёна і страсна апавядае пра тое, як украінскі бядняк Тарас Галота знайшоў праўду для свайго народа ў большэвіцкім Пецярбургу, у вялікага Леніна. Гордасць і краса сцэнічнага мастацтва совецкай краіны—Маскоўскі Мастацкі Акадэмічны тэатр паказаў, як беднейшае рускае сялянства дабілася сапраўднай чалавечай праўды, якую прынесла з сабой соцыялістычная рэволюцыя, і ўпершыню селянін стаў роўнапраўным працаўніком сваёй дзяржавы. Аб гэтым апавядае п'еса Н. Вірты «Зямля». Старэйшы рускі драматург К. Трэнеў разам з Маскоўскім Акадэмічным Малым тэатрам у эпічных і суровых фарбах паказаў найвялікшыя гістарычныя падзеі, якія адбыліся на гранітных берагах слаўнай Невы ў 1917 годзе.

Беларускія совецкія тэатры ў юбілейны год стварылі яркія спектаклі аб мужнай і гераічнай барацьбе беларускага народа, пры дапамозе вялікага рускага народа, пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі, з лютымі германа-польскімі інтэрвентамі. У спектаклях «Партызаны», «У пушчах Палесся» тэатры паказваюць народных герояў, якія ахвяравалі сваім жыццём у барацьбе з катамі беларускага народа, якія таптапі нашыя палі, палілі гарады і імкнуліся затапіць у крыві заваёвы Кастрычніцкай рэволюцыі.

Пашырыўся круг тэм у спектаклях беларускіх тэатраў. Створаны вобразы герояў совецкай эпохі, слаўных барацьбітоў з фашысцкімі шпіёнамі, вобразы гордых сокалаў нашай радзімы—совецкіх лётчыкаў. Горкі і Астроўскі сталі любімымі і папулярнымі драматургамі ў беларускага совецкага гледача. Выраслі маладыя таленавітыя акторскія і рэжысёрскія кадры. У сумеснай дружнай рабоце з тэатрам творча растуць беларускія совецкія кампазітары, якія напісалі таленавітыя совецкія оперы і першы беларускі совецкі балет.

Заклятыя ворагі совецкага народа—фашысцкія шпіёны і агенты замежных разведак, карыстаючыся палітычнай слепатой, сямейнасцю, кругавой парукай, зажымам крытыкі і самакрытыкі ва Упраўленні, прабраліся ў склад мінулага кіраўніцтва Упраўлення і прыклалі сваю брудную лапу і да рэпертуараў тэатраў. Ні адна з лепшых п'ес совецкага рэпертуара мінулага году (Пагодзіна, Трэнева, Карнейчука) не трапіла ў рэпертуар беларускіх тэатраў. А замест гэтага рэпертуар засмечваўся шкоднымі альбо нізкаякаснымі творамі—«У нашы дні», у Яўрэйскім тэатры, «Агні Маяка» ў чатырох тэатрах БССР. Упраўленне па справах мастацтваў і асабліва Рэпертком, на чале якога стаялі неадпавядаючыя работнікі, не вялі барацьбы за высокую якасць выпускаемых спектакляў. У рэзультаце гэтага з'явіўся рад шэрых, халодных сцэнічных твораў. П'есы А. М. Горкага не допускаліся ў калгасныя тэатры. Каштоўныя спектаклі мінулага рэпертуара, як «Інтэрвенцыя» (ЯДТ), «Разлом» (Віцебскі тэатр), «Капітанская дачка» (Белдзяржтэатр) і ўвесь існаваўшы рэпертуар опернага тэатра,—былі зняты з рэпертуара пад рознымі прычынамі. Удачы маладых актораў і драматургаў у многіх выпадках засталіся без ніякае ўвагі. За год нават не была праведзена ні адна творчая канферэнцыя.

Новае кіраўніцтва Упраўлення па справах мастацтваў (тт. Азірскі і Земцаў) павінны па-большэвіцку ўзначаліць барацьбу па ліквідацыі вынікаў шкодніцтва ў галіне мастацтваў. Рашуча ачышчаючы ад варожага ахвосця, ад чужых і не заслугоўваючых давер'я людзей як апарат Упраўлення, так і паасобныя мастацкія ўстановы.

Задачай новага кіраўніцтва Упраўлення з'яўляецца складанне новых рэпертуарных планаў з такім разлікам, каб сучасная совецкая тэматыка была пастаўлена ў цэнтры рэпертуара тэатраў. Рэпертуарныя планы неабходна вынесці на абмеркаванне шырокай грамадскасці і на старонкі большэвіцкага друку. Важнейшай задачай Упраўлення па справах мастацтваў з'яўляецца вырошчванне новых маладых драматургаў і кампазітараў з таленавітай мастацкай моладзі. Крытычнае асваенне класічнай спадчыны павінна заставацца ў цэнтры ўвагі мастацкага фронта БССР. І таму ў рэпертуары беларускіх тэатраў павінны ганаровае месца заняць класічныя творы драматургаў і кампазітараў вялікага рускага народа, народаў СССР, а таксама і лепшыя ўзоры еўрапейскай класікі.

Па-большэвіцку змагаючыся за авалоданне новымі вышынямі соцыялістычнага мастацтва, выкрываючы рэшткі варожага ахвосця ў мастацтве, беларускія совецкія тэатры дасягнуць яшчэ большага росквіту соцыялістычнага мастацтва.

Якуб Колас

ІСПАНСКАМУ НАРОДУ

Як многа забітых—нявінных ахвяр!
У грудзях пылае нянавісці жар...
Я вогнішчы бачу папаленых сёл,
Гарачаю кроўю напоены дол.

Я чую гудзенне драпежных машын,
Я чую стагнанне дзяцей і жанчын
І трупы забітых стаяць у вачах
І помста на твары, ва ўзнямелых руках.

Я бачу, як цешыцца рымскі мяснік,
Як выскаліў зубы берлінскі разнік,
Як плешча ў ладошкі ім лорд Чэмберлен,
Як важыць здабыткі банкірскі бязмен,
Як цені пускае, разводзячы блуд,
Герой «неўмяшання», двурушны Плімут.

Я бачу, як збоку міністар-француз
Стаіць, паглядае на наглы саюз—
Што душыць свабоду фашысцкі бандыт,
Што цяжка ступае на горла капыт!
Такога бяздуш'я нідзе не было.
Так подла яшчэ не тварылася зло...
Я сэрцам з табою, іспанскі народ!
Я веру з табою—час пройдзе нягод.
Твой сцяг перамогі ўзаўецца ў гары,
Як сонечны промень у кудрах зары.
Геройства тваё не пагасне ў вяках,
А тупасць забойцаў утопіцца ў прах.





Дэманстрацыя моладзі г. Менска ў дзень 24 гадавіны МЮД.
НА ЗДЫМКАХ: калоны дэманстрантаў.

Фото В. Грунтфеста, Л. Мазелава (БСФ).

ІДЗЕ МАЛАДОСЦЬ

НА МЮД'АЎСКАЙ ДЭМАНСТРАЦЫІ У МЕНСКУ

Менск зноў прыбраўся, пахарашэў. На вуліцах, на плошчах ярка палыхаюць чырвоныя сцягі, гараць залатымі літарамі лозунгі, прысвечаныя XXIV гадавіне Міжнароднага юнацкага дня. Моладзь сталіцы ордэнаноснай Совецкай Беларусі яшчэ раз прадэманстравала сваю бязмежную любоў да маці-радзімы, мудрага правадыра, настаўніка, бацькі таварыша Сталіна.

Яшчэ ад самага ранняга 6 верасня на вуліцах Менска было ажыўлена, неяк незвычайна ўрачыста. Людзі неслі вялікія ахапкі жывых кветак, везлі іх на аўтамашынах, на цялежках. Ля магазінаў кветак і ларкоў было шмат народу: чарга за кветкамі.

З 11 гадзін дня пачалі запаўняць вуліцы горада калоны дэманстрантаў. У іх на руках—кветкі. Над калонамі—партрэты вялікага друга працоўнай моладзі, настаўніка і правадыра—таварыша Сталіна, яго баявых саратнікаў—таварышоў Молатава, Варашылава, Ежова, Калініна, Жданава, Мікаяна. Лозунгі салідарнасці з працоўнай моладдзю гераічнага іспанскага народа, які змагаецца за вызваленне свайго края ад варварскай фашысцкай навалы, лозунгі ў гонар гераічнай кітайскай моладзі, якая на франтах вядзе барацьбу з крывавым захватчыкам — японскай фашысцкай ваеншчынай.

У 2 гадзіны 30 мінут на плошчу неўміручага Леніна прыходзяць першыя калоны дэманстрантаў. Ідуць калоны школьнікаў горада міма трыбуны, на якой знаходзяцца кіраўнікі партыі, урада і комсамола Совецкай Беларусі. Над школьнікамі — мора рознаколерных сцяжкоў, плакаты і лозунгі. Іх дэвіз — выдатна вучыцца; быць такімі як Чкалаў, Громаў, Папанін. Над імі палыхаюць лозунгі «Дзякуй таварышу Сталіну за шчаслівае маленства».

Урачыста і велічна грымяць медныя трубы, гучаць маршы, любімыя песні совецкай моладзі, совецкага народа.

Праходзіць моладзь Сталінскага раёна горада Менска. Нясецца водгулле магутнага «ура» ў гонар вялікага Сталіна, у гонар слаўнай Чырвонай Арміі і яе палкаводца таварыша Варашылава..

Праходзяць чырвоныя пагранічнікі і байцы ўнутранай аховы НКВД. Яны вітаюць будучых выдатных байцоў Чырвонай Арміі — прызыўнікоў. Прагатваюцца выгукі «ура» таварышу Сталіну, сталінскаму наркому таварышу Ежову, які разграміў асіныя гнёзды трацкісцка-бухарынскай, нацыянал-фашысцкай і іншай пагані.

На плошчы Леніна — калоны Варашылаўскага раёна горада. Каля трыбуны ў момант расчыняюцца вароты. На пярэднім плане — вялікі бронзавы бюст таварыша Сталіна. Праходзяць маладыя рабочыя, совецкая інтэлігенцыя, чырвонаармейцы з сцягамі, плакатамі, партрэтамі правадыроў. Ідуць ваенным маршам прызыўнікі. І зноў нарастае магутным прыбоем «ура» і воклічы ў гонар натхніцеля на гераічныя подвігі, у гонар самага любімага і дарагога Сталіна.

Гучыць баявая песня «Если завтра война». Праходзяць калоны дэманстрантаў Кагановіцкага раёна. Ідуць тысячы студэнтаў ВНУ, рабфакаў і тэхнікумаў. На іх маладых і вясёлых абліччах ззяе ўпэўненасць у заўтрашнім дні. Совецкай моладзі шырока адчынены дзверы ў жыццё: вучыся, твары і працуй на славу вялікай радзімы!

Горда крочыла моладзь горада Менска. Весела святкавала яна сваё вялікае свята інтэрнацыяналізма, баявога агляду сіл міжнароднай працоўнай моладзі.

Позна на вуліцах і плошчах, у садах і парках ліліся гукі музыкі і песень.

ЧЫРВОНААРМЕЙСКІ АНСАМБЛЬ ПЕСНІ І ПЛЯСКІ БАВА

У студзені 1938 года па ініцыятыве ваеннага Совета БАВА пры Смаленскім Доме Чырвонай Арміі імя Фрунзе быў створан акругавы ансамбль чырвонаармейскай песні і пляскі.

У склад ансамбля былі прыняты лепшыя выканаўцы, адабраныя на алімпіядах чырвонаармейскай самадзейнасці акругі.

Перад маладым калектывам была пастаўлена задача ахапіць культурным абслугоўваннем часці БАВА, паказаць байцам, камандна-начальніцкаму складу і сем'ям камандзіраў высокамастацкую, ідэйна насычаную хараву праграму, дапамагчы разгортванню чырвонаармейскай мастацкай самадзейнасці ў часцях. Калектыў ансамбля на чале з кіраўніком тав. Усачовым з першых-жа дзён уключаецца ва ўпартую работу па авалоданню майстэрскага выканання песні і пляскі. Малады балетмейстар чырвонаармеец тав. Гаўрылаў праводзіць узмоцненую падрыхтоўку маладых танцораў. Ствараецца рад масавых плясак і індывідуальных танцаў, — масавы народны танец «Калінка», чырвонаармейская пляска, казачая пляска і інш.

З песень да XX гадавіны РСЧА ансамбль ужо меў больш дваццаці твораў. Сярод іх класічныя творы «Хор спадарожнікаў» (музыка Рубінштэйна), «Цішэй-цішэй» (музыка Вердзі), цэлы рад народных твораў і песень аб нашай радзіме. Апрача таго, быў створаны літаратурна-музыкальны мантаж, прысвечаны дваццатай гадавіне РСЧА. Адначасова расце ансамбль і колькасна ў сваім складзе. У сучасны момант калектыў мае 60 выканаўцаў — спевакоў і танцораў. За перыяд ад 17 лютага да 1 жніўня 1938 г. ансамбль паказаў больш 150 канцэртаў, абслугоўваючы вайсковыя часці БАВА і насельныя пункты БССР і РСФСР—Смаленскай, Калінінскай і Орлоўскай абласцей.

Сярод выканаўцаў ансамбля ёсць нямала таленавітых спевакоў і танцораў, як, напрыклад, тт. Паўлаў, Наскоў, Куцераў, Сарокін, Салдатаў, Гаўрылаў, Смышляеў, Перкун, Панамарэнка, Перавозчыкаў.

Выступленні ансамбля ўсюды праходзяць з выключным поспехам. У водгуках камісары і камандзіры часцей дзякуюць маладому калектыву за цудоўнае выкананне песень і плясак, за дапамогу чырвонаармейскай самадзейнасці.

Побач з творчай работай, у ансамблі рэгулярна праводзіцца палітычная вучоба, ваенныя заняткі і заняткі па фізкульт-падрыхтоўцы. Расце комсамольская арганізацыя. Зараз ансамбль мае моцную комсамольскую арганізацыю ў колькасці дваццаці пяці чалавек.

На зімовы перыяд у ансамблі намячаецца павелічэнне складу выканаўцаў—спевакоў і танцораў у колькасці 20—25 чалавек. Апрача таго, намячаецца стварэнне струннай аркестровай групы ў колькасці 11 чалавек для суправаджэння канцэртаў ансамбля.

Г. ФРАЛОЎСКІ.

Аб пытаннях работы тэатраў БССР

Тэатры БССР уступілі ў новы тэатральны сезон.

Оперны тэатр, адставаўшы да апошняга часу, перабудоўваецца на-хаду і рыхтуецца пачаць спектаклі ў кастрычніку ў памяшканні Яўрэйскага тэатра.

Мінулы тэатральны сезон прынёс рад творчых удач, якія паказваюць рост беларускага совецкага тэатральнага мастацтва. Беларускі драматычны тэатр закончыў сезон яркім, хвалюючым спектаклем «Партызаны» (п'еса К. Крапівы, пастаноўка Л. Рахленка), у якім у вобразнай мастацкай форме ўваскрашаюцца драматычныя старонкі барацьбы беларускага народа са сваімі спрадвечнымі ворагамі — польскімі панамі — у часы грамадзянскай вайны.

Гісторыя беларускага народа, яго барацьба з ворагамі стала арганічнай тэмай тэатра. Гэтай тэме прысвячаецца спектакль «Салавей» (п'еса З. Бядулі, пастаноўка Л. Рахленка і Л. Літвінава) і новая работа тэатра «Кацярына Жарнасек» (п'еса М. Клімковіча, пастаноўка рэжысёра М. Зорава).

Народны гераізм у барацьбе з белапольскімі акупанцкімі бандытамі — лейтматыў і асноўная мастацкая вартасць спектакля «У пушчах Палесся» (п'еса Я. Коласа, пастаноўка В. Дарвішава), «Сям'я Авадзіс» у Яўрэйскім тэатры (п'еса П. Маркіша, пастаноўка В. Галаўчынера) — перадае атмасферу маральна-палітычнага адзінства совецкага народа, гатоўнасць народа абараняць далёка-ўсходнія граніцы нашай радзімы ад подлых японскіх самураяў. Гэтай-жа задачы служыць і «Наша зброя» (аўтар А. Крон, пастаноўка Ю. Палічынецкага) у Тэатры юнага гледача.

Спектаклі «Вочная стаўка» (у БДДТ, Віцебскім і Рускім тэатрах) выхоўваюць нашага гледача ў духу рэвалюцыйнай пільнасці і непрымірымасці да подлых ворагаў народа — трацкісцка-бухарынскіх і нацыянал-фашысцкіх бандытаў.

Горкаўскі рэпертуар беларускіх тэатраў папоўніўся добрым спектаклем «Мяшчане».

Беларускі гледач упершыню ў мінулым сезоне ўбачыў адну з лепшых совецкіх опер «Ціхі Дон» у Беларускім тэатры оперы і балета і совецкую аперэту «Вяселле ў Малінаўцы» ў тэатры Музкамедыі. XX-годдзе Вялікай Кастрычніцкай социялістычнай рэвалюцыі Рускі і Дзіцячы тэатры сустрэлі спектаклем «Як гартавалася сталь» паводле рамана Н. Остроўскага. Барысаўскі калгасны тэатр да юбілею парадаваў гледача шчырым і цёплым спектаклем «Партызаны» (пастаноўка А. Данілава).

З спектакляў, пастаўленых на драматычных творах дарэвалюцыйнай спадчыны, вельмі яркім з'яўляецца «Дзеці Ванюшына» ў Віцебскім тэатры (пастаноўка Ц. Сяргейчыка).

Мінулы тэатральны сезон паказаў рост акторскіх кадраў.

Было-б няправільным сказаць, што пералічаныя спектаклі беззаганныя, што яны ўжо з'яўляюцца ўзорамі класічнага совецкага мастацтва. Нажаль, гэта яшчэ не так. У добрых у сваёй аснове, спектаклях яшчэ многа слабых старон, якія неабходна перамагчы ў будучай рабоце тэатраў. Вобразы ў гэтых спектаклях неаднолькавай мастацкай сілы і філасофскай глыбіні. Яшчэ многа ў іх трафарэтнага і схематычнага. Вельмі часта выразная мастацкая мова падмяняецца маралізуючымі сентэнцыямі аўтара і тэатра, а таксама і рэзанёрствам. Неаднолькавы культура і талент пастаноўшчыкаў спектакляў.

Ёсць яшчэ адна сур'ёзная загана ў творчай рабоце нашых тэатраў — гэта расхістванне спектакляў, утрата імі ў працэсе ігры першапачатковай свежасці і абаяльнасці. Так, напрыклад, спектакль «Слава» (Рускі тэатр), які з вялікай цікавасцю глядзеўся пасля прэм'еры ў Магілеве, на гастролях у Менску значна паблядне́ў і знізіўся ў сваёй якасці. Тое самае можна сказаць нават і пра такі добры спектакль, як «У пушчах Палесся», які з прычыны адсутнасці да яго ўвагі рэжысуры, стаў значна горшым, чым ён быў у пачатку.

Усе гэтыя з'явы адбіваюцца на якасці сцэнічных твораў, пастаўленых у мінулым сезоне.

Асноўным недахопам рэпертуара 1938 года з'яўляецца тое, што ён быў складзены былымі кіраўнікамі Управлення па справах мастацтваў беспрынцыпна і хаатычна. У гэтым рэпертуары адчуваецца след варожай рукі, якая арудавала ў гэтай установе.

У той час, калі тэатры Саюза ССР даўно ставілі спектаклі з удзелам вобраза вялікага правадыра народаў В. І. Леніна, у нас такая п'еса ўключана ў рэпертуар толькі ў канцы 1938 года. Лепшыя творы совецкіх драматургаў (Трэнева, Леонава, Вірты і інш.) зноў-такі не знайшлі месца ў рэпертуары беларускіх тэатраў. П'есы, якія ставілі тэатры Масквы, Ленінграда, Кіева і іншых гарадоў Совецкага Саюза, на якіх выхоўваўся наш гледач, рос актор, несучы гледачам новыя совецкія ідэі, адлюстроўваючы актуальныя праблемы социялістычнага грамадства, —чамусьці не паказаны беларускаму гледачу.

Затое п'еса «У нашы дні», — твор, які рэзка і справядліва быў раскрытыкован у «Литературной газете», — ставіцца ў Яўрэйскім дзяржаўным тэатры. Спектакль гэты паказвае совецкую рэчаіснасць у крывой люстры, аднак гэта нікога з былых «кіраўнікоў» Управлення не турбавала. Бо іх, мусіць, больш цікавіла тое, каб дзесьці ў бюракратычных справах запісаць, што пастаўлена п'еса аб совецкіх дётчыках. Слаўныя сокалы сталінскай авіяцыі сваёй гераічнай працай даказалі, што яны варты таго, каб аб іх напісалі высокамастацкі твор.

«Агні маяка» таксама нізкапробная п'еса. Але і яна чамусьці пастаўлена ў чатырох тэатрах БССР.

У гэтым годзе напісана і пастаўлена некалькі совецкіх беларускіх п'ес. Але большасць п'ес беларускіх совецкіх пісьменнікаў напісана на гістарычныя тэмы старажытнай Беларусі, ці з часоў імперыялістычнай і грамадзянскай вайны. Нічога не было зроблена для ствярэння арыгінальных драматургічных твораў з сучаснага жыцця. І ў канцы 1938 года тэатры не змогуць паказаць ні аднаго спектакля на сучасную тэму, якая зараз хвалюе совецкі народ.

Што датычыць класікі, дык тут таксама не ўсё ў парадку. Невядома, чаму забыты пушкінскія спектаклі, якія былі пастаўлены да юбілею. П'есы вялікага совецкага пісьменніка, зачынацеля социялістычнага рэалізма М. Горкага зусім адсутнічаюць у рэпертуары калгасных тэатраў. Горкаўскія спектаклі ў мінулых сезонах у Белдзярждрамтэатры і ў Рускім тэатры і спектаклі гэтага сезона ў Віцебскім тэатры паказалі, што нашы творчыя калектывы пры крапатлівай рабоце здольны авалодаць спадчынай горкаўскай драматургіі. Не гледзячы на некаторыя недахопы гэтых спектакляў, усё-ж наш гледач сустрэў гэтую работу стачоўча.

Культурныя запатрабаванні совецкага гледача значна ўраслі. Таму яго не могуць задаволіць другарадныя п'есы замежных аўтароў, у той час, калі багатая драматургічная спадчына еўрапейскіх класікаў застаецца амаль некранутай. Чаму да гэтага часу нашы рэспубліканскія тэатры не ставяць Шэкспіра? Настаў час сур'ёзна задумацца над гэтым. Мы лічым, што трагедыі і камедыі выдатнага песняра Адраджэння павінны заняць належнае месца ў рэпертуары беларускіх тэатраў.

Зусім дрэнна з рэпертуарам калгасна-соўгасных тэатраў. Былое кіраўніцтва Управлення было не зацікаўлена ў прыцягненні беларускіх драматургаў да работы над п'есамі для гэтых тэатраў. Затое яно прыняло ўсе меры, каб наваднiць іх рэпертуар такімі нізкаякаснымі п'есамі, як «Агні маяка», «Мая маці» і інш. Апрача гэтага, калгасныя тэатры ўвесь час застаюцца без дапамогі. Былыя кіраўнікі з Управлення па справах мастацтваў прымацялі гэтыя калектывы да рэспубліканскіх тэатраў, аднак, праверыць, як дапамагаюць ім тэатры, яны не здагадаліся і соўгасна-калгасныя тэатры вымушаны працаваць на працягу года над чатырма-пяццю спектаклямі з адным рэжысёрам. Да гэтага часу не практыкуюцца камандыроўкі лепшых рэжысёраў і актораў на асобныя пастаноўкі ў соўгасна-калгасныя тэатры. Трэба ліквідаваць тую замкнёнасць, якая існуе яшчэ да гэтага часу ў нашых тэатральных калектывах. Неабходна, каб беларускія рэжысёры ставілі спектаклі не толькі ў тых тэатрах, дзе яны працуюць стала, але і ў іншых тэатрах. Гэта значна ўзбагаціць вопыт іх і тэатраў.

Работнікам тэатральнага фронта неабходна павесці барацьбу супроць шарасці, няяркасці, рознага роду штукарстваў, якія маюць яшчэ месца ў некаторых спектаклях. Гэта можна перамагчы толькі ўпартай творчай работай над вобразам, над мізансцэнамі і жэстамі і ўсімі іншымі кампанентамі спектакля.

Вопыт 1938 года павінен навучыць работнікаў Управлення складанню рэпертуарнага плана, які з'яўляецца надзвычай адказнай і складанай справай.

Неабходна зараз прыступіць да складання рэпертуарных планаў. У цэнтры ўвагі гэтых планаў павінны быць пастаўлены тэмы, якія хвалююць совецкага гледача. Неабходна, каб у рэпертуары былі п'есы аб ролі таварыша Сталіна і яго саратнікаў у стварэнні БССР, аб штодзённай дапамозе партыі і саюзнага ўрада беларускаму народу. Неабходна стварыць п'есы аб слаўных работніках НКВД і пагранічніках, якія пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі і пры дапамозе совецкага народа ачысцілі нашу зямлю ад варожай пагані—трацкісцка-бухарынскага смецця, шпіёнаў і дыверсантаў. Пісьменнік Шапавалаў у супрацоўніцтве з дэпутатам Вярхоўнага Совета БССР кампазітарам Туранковым працуе зараз над операй з сучаснага жыцця пагранічнікаў. Гэта будзе першая опера, якая адлюструе падзеі сённяшняга дня. Неабходна, каб оперны тэатр абкружыў Шапавалава і Туранкова вялікай увагаю.

У рэпертуарны план павінны быць уключаны п'есы на тэмы гераічнай барацьбы слаўнай Чырвонай Арміі на манчжурскай граніцы з японскімі самураямі аб гераічнай барацьбе іспанскага і кітайскага народаў супроць фашысцкіх інтэрвентаў, аб выдатных людзях нашай радзімы — стаханаўцах фабрык, заводаў, калгасных палёў, аб інтэлігенцыі, узрошчанай краінай Советаў; аб цудоўным маладым пакаленні, выхаваным ленінска-сталінскім комсамолам, і рад іншых надзенных тэм нашай совецкай рэчаіснасці.

Трэба зламаць бюракратызм і кабінетнае выпрацоўванне рэпертуарных планаў. Планы неабходна абмяркоўваць у тэатрах з прыцягненнем шырокай грамадскасці — артыстаў, рэжысёраў, мастакоў, кампазітараў, пісьменнікаў, стаханаўцаў і журналістаў.

Управленне павінна склікаць усебеларускую канферэнцыю работнікаў мастацтваў па абмеркаванню новага рэпертуарнага плана 1939 года, на якую трэба запрасіць прадстаўнікоў грамадскасці БССР.

Мерапрыемства, якое пачаў Дзяржаўны тэатр оперы і балета па ўцягванню шырокіх колаў грамадскасці ў абмеркаванне новых опер у працэсе іх стварэння (праслухоўванне хораў і абмеркаванне макета оперы «Міхась Падгорны», прагляд рэпетыцыі балета «Лебядзінае возера», праслухоўванне двух актаў оперы Н. Шчэглова «Кацярына Жаранасек»), абмеркаванне партыйным актывам Менска п'есы «Сапраўднае жыццё» таксама з'яўляецца станоўчым вопытам, які неабходна пашырыць. Новаму кіраўніцтву Управлення па справах мастацтваў пры СНК БССР неабходна стварыць мастацкі совет пры Управленні і больш прыцягваць грамадскасць да абмеркавання новых мастацкіх твораў. Шкоднікі на фронце мастацтва імкнуліся ізаляваць творчыя калектывы адзін ад аднаго. Управленню і ЦП працмастацтва і драмсекцыі ССПБ неабходна канчаткова ліквідаваць гэтую раз'яднанасць у асяроддзі работнікаў мастацтва. Мы раім у бліжэйшы час склікаць творчую нараду і абмеркаваць найбольш удалыя вобразы, створаныя маладымі акторамі і артыстамі старэйшага пакалення. Напрыклад, работа артыста Малчанава над вобразам вялікага Леніна, Бараноўскага ў ролі дзеда Бадыля, Ільінскага — дзеда Талаша, Орлова — Паўкі Карчагіна, заслужанай артысткі БССР Александроўскай — Аксіння, Васільевай — Одэта, Фрыдман — Суламіф. Неабходна абмеркаваць спектаклі «Партызаны», «У пушчах Палесся», «Суламіф», «Наша зброя», «Ціхі Дон», «Вяселле ў Малінаўцы».

Мы прапануем абмеркаваць рэжысёрскія экспліканцыі найбольш цікавых новых спектакляў — «Чалавек з ружжом», «Кацярына Жарнасек», оперы «Міхась Падгорны», балета «Салавей» на творчых нарадах пры Управленні па справах мастацтваў пры СНК БССР.

Настаў ужо час наладзіць сістэматычную вучобу ў тэатрах.

Неабходна стварыць пры Управленні групу нештатных рэжысёраў і актораў, з лепшых работнікаў рэспубліканскіх тэатраў для пастаноўкі спектакляў, і канкрэтнага аказання сістэматычнай дапамогі калгасна-соўгасным тэатрам. Пара ўжо маладым калгасным тэатрам пачаць працаваць над п'есамі М. Горкага.

Рэспубліканскім тэатрам трэба ўключыць у свой рэпертуар бяссмертныя творы Шэкспіра.

Н. АНДРЭЕЎ.

АД РЭДАКЦЫІ.

Мы адкрываем гэтым артыкулам абмеркаванне вынікаў мінулага тэатральнага сезона і перспектыў будучага сезона. Спадзяемся, што работнікі тэатраў, пісьменнікі, крытыкі выкажуцца на старонках нашай газеты па пытаннях, пастаўленых у гэтым артыкуле.

ЛЕНІН І СТАЛІН У ТВОРЧАСЦІ БЕЛАРУСКІХ МАСТАКОЎ

Кожная гістарычная эпоха, як вядома, мае сваіх правадыроў і герояў. У вобразах іх увасоблены характэрныя асаблівасці данага гістарычнага часу. Гэтае абагульняючае значэнне гістарычных вобразаў не магло не прыцягнуць увагі мастакоў, якія, вядома, той ці іншы вобраз трактавалі паводле сваіх класавых поглядаў на мастацтва. Якабінец Луі Давід, напрыклад, у лепшыя годы свайго творчага жыцця, апяваў Французскую буржуазную рэвалюцыю і яе герояў. Скульптар Жуль Далу — адважны ўдзельнік Парыжскай Комуны — апяваў у сваёй творчасці вобразы рабочых, як новых герояў сваё эпохі.

Тым больш зразумела захопленасць не толькі совецкіх мастакоў, а і прагрэсіўных мастакоў усяго свету да такіх велізарных вобразаў, як вобразы Леніна і Сталіна. Социялістычная эпоха адкрыла ў асобе першай социялістычнай дзяржавы — Совецкага Саюза, новы гістарычны шлях для працоўнага чалавецтва, вызваліўшы шырокія працоўныя масы ад эканамічнага і духоўнага рабства. У вобразах Леніна і Сталіна ўсё прагрэсіўнае чалавецтва бачыць найвялікшых геніяў новай гісторыі чалавецтва.

У Совецкай краіне, дзе ў асноўным перамог социялізм, свае лепшыя думкі, лепшыя парывы свайго сэрца народ аддае Леніну і Сталіну. Разам з усімі народамі гэту непагасную любоў і адданасць вялікім правадырам рэвалюцыі Леніну і Сталіну выражае ў сваёй мастацкай творчасці беларускі народ.

У беларускім жывапісу вобразы Леніна і Сталіна найбольш поўна прадстаўлены ў творчасці старых беларускіх мастакоў — В. Волкава і Я. Кругера. Што датычыць беларускіх скульптараў, дык вобразы Леніна і Сталіна ў творчасці большасці з іх займаюць пераважнае месца. Зразумела, што ўсё прароблене нашымі жывапісцамі і скульптарамі ёсць толькі пачатак глыбокага раскрыцця вобразаў Леніна і Сталіна ў мастацтве.

Партрэт В. І. Леніна, зроблены мастаком Волкавым яшчэ ў 1926 годзе, выгадна адрозніваецца ад партрэтаў іншых мастакоў і па жывапіснай тэхніцы, і па арыгінальнасці замыслу. Ленін паказан мастаком нібы выслухоўваючым свайго субяседніка. Левай рукой Ільіч абапёрся на столік, на твары — напружаная ўвага. Фон трактуецца як трэцеступенны; уся ўвага гледача канцэнтруецца на ярка асветленым твары Владзіміра Ільіча. І вочы, і некалькі напружаныя бровы, і магутны лоб—перадаюць велічны і просты, толькі Леніну ўласцівы вобраз геніяльнага мысліцеля і вялікага пролетарскага рэвалюцыянера.

Але пры ўсіх гэтых дадатных якасцях гэтага партрэта нельга не адзначыць і недахопаў. Задумаўшы арыгінальную кампазіцыю, мастак усё-ж не змог перадаць у партрэце ўсяе прастаты ленінскай велічы: постаць Ільіча выглядае на палатне некалькі скаванай і нібы пазіруючай.

Пры ўсіх памянёных недахопах партрэт Леніна работы В. Волкава па сваёй глыбіні значна вышэй аналагічных работ мастака Кругера. У Менскім Доме пісьменніка ёсць два партрэты гэтага мастака: партрэт Леніна і партрэт Сталіна. Кругер — мастак вялікай культуры, вопытны партрэтыст. Але пры ўсім гэтым яго партрэтам нехапае таго ўнутранага адухаўлення, вярней кажучы — свайго аўтарскага, глыбока прачутых і ўсвядомленых адносін да вобразаў вялікіх правадыроў, без чаго вобразы гэтыя з-пад кісці Кругера выходзяць у значнай меры фатаграфічнымі, пазбаўленымі ўласцівай гэтым вобразам рэвалюцыйнай велічы і тэмперамента.

Гаворачы аб партрэтах Кругера нельга не сказаць наогул аб совецкім партрэце. Вядома, што адна жывапісная тэхніка яшчэ не робіць партрэта.

Калі мы гаворым аб совецкім партрэце, дык тут мы маем на ўвазе не толькі высокую жывапісную тэхніку, але зусім іншыя якасці партрэта, раскрытыя праз светапогляд совецкай эпохі. Лепшымі рэалістамі ў мастацтве заўсёды былі тыя мастакі, якія ў творчасці сваёй умелі прасякнуцца і натхніцца перадавымі думкамі і пачуццямі свайго часу і праз гэта надаць сваім мастацкім вобразам новыя якасці. Прыгадаем, хаця-б Мікельанджэло, у творчасці якога з вялізнай сілай выражан бурны дух эпохі Адраджэння.

Для таго, каб мастак змог напісаць совецкі партрэт, яго кісцю павінна кіраваць не толькі жывапісная тэхніка, але і тое пачуццё новай жыццёвай праўды, якое ў момант творчасці праяўляецца ў мастака як рэзультат яго социяльнай практыкі, яго глыбокіх сувязей з вытворчай і духоўнай практыкай свайго народа. Нажаль, гэтых глыбока-социяльных якасцей нехапае некаторым нашым мастакам, у тым ліку і Кругеру.

У святле сказанага можна ўявіць сабе, якой глыбокай ідэйнасці і творчага хвалявання патрабуе ад мастака работа над такімі выключнымі вобразамі, як вобразы Леніна і Сталіна, найвялікшых рэвалюцыянераў думкі і справы, прадаўжальнікаў перамагаючага рэвалюцыйнага вучэння Маркса і Энгельса.

Настойліва і многа працуе над вобразамі Леніна і Сталіна беларускі скульптар З. Азгур. Крок за крокам, ад аднаго партрэта да другога, Азгур імкнецца знайсці найбольш яркае і праўдзівае вырашэнне творчай задачы. Ён разумее ўсю найглыбейшую гістарычную многагранасць гэтых вялікіх вобразаў. Можна толькі вітаць імкненне Азгура прысвяціць работам над гэтымі вобразамі рад год свайго творчага жыцця.

У першыя годы сваёй творчасці Азгур бярэцца за складаную кампазіцыю — за работу над трохметравай скульптурай таварыша Сталіна. У гэтай рабоце адчуваецца яшчэ нявопытнасць скульптара: слабая лепка і нячоткая кампазіцыя. Надаўшы непрымусовую позу постаці правадыра, Азгур не знайшоў для яе неабходнага стану для рук. Распрацована скульптура слаба і далёка не перадае вобраз Сталіна як правадыра і чалавека.

Гэтую работу Азгура няёмка нават ставіць у параўнанні з аналагічнымі скульптурамі таварыша Сталіна, выкананымі вядомымі маскоўскімі скульптарамі Меркуравым і Якаўлевым. Як недалёкі работы гэтых скульптараў ад дасканаласці, але яны ўсё-ж больш поўна перадаюць вобраз правадыра, чым памянёная скульптура работы Азгура. У сучасны момант гэтую скульптуру можна разглядаць толькі як адзін з вопытаў Азгура на шляху да разумення сталінскага вобраза.

У наступнай рабоце, у вялікім бюсце таварыша Сталіна, скульптару Азгуру параўнальна ўдаецца раскрыць некаторыя характэрныя сталінскія рысы. Бюст гэты тэхнічна граматны, ён вылучаецца дэталізаванай трактоўкай форм, але ў цэлым вобраз застаецца нявыразным. Вобраз празмерна гераізіраваны, скульптару не ўдалося ўдыхнуць у скульптуру тую надзвычайную чалавечую цеплыню, якая гэтак-жа ўласціва Сталіну, як і яго выключная рэвалюцыйная воля. Вобраз атрымаўся халодны.

Вышэй мы ўжо гаварылі, што кісцю ці стэкою мастака павінна кіраваць не толькі тэхніка, але і пачуццё жыццёвай праўды, якое ў момант творчасці праяўляецца ў мастака як глыбока ўсвядомленая і прачутая ідэя ствараемага вобраза, з чым непарыўна звязан і тэмперамент мастака. Гэтай другой і вельмі важнай якасці нехапае Азгуру.

Тут наогул да месца будзе даць кароткі аналіз акадэмічных слабасцей Азгура. Мы ўжо адзначалі яго тэхнічную граматнасць. Гэтай граматнасцю асабліва выгадна адрозніваюцца яго апошнія работы. Па работах Азгура адчуваецца, што ён імкнецца знайсці вобраз і ўласцівую яму форму не столькі праз самы змест вобразу, колькі імкнецца знайсці гэты вобраз праз форму. Вучыцца і ўпарта працаваць над формай, вядома, трэба, але дрэнна, калі форма пануе над скульптарам.

Да найдрабнейшых падрабязнасцей, распрацоўваючы скульптуру Сталіна, Азгур не можа ухапіць тое галоўнае і характэрнае, што па сутнасці і вызначае вобраз. Яго новы бюст таварыша Сталіна, які дэманстрыраваўся на апошняй выстаўцы, тэхнічна можа быць прызнаны дасканалым, але па сутнасці гэта работа ў значнай ступені акадэмічная, якая не перадае духоўную веліч Сталіна як правадыра і чалавека.

У апошні час Азгур перайшоў да больш складаных кампазіцый. Гэтакія—яго арыгінальны эскіз скульптуры Сталіна, які сядзіць у крэсле і курыць трубку, а таксама складаная і вельмі ўдалая кампазіцыя, паказваючая ідучых Леніна і Сталіна.

Апошнюю работу варта асобна адзначыць. Ленін даверліва і па-сяброўску паклаў левую руку на плячо Сталіна, правай рукой паказвае яму, як свайму вернаму прыемніку, шлях да светлага будучага чалавецтва. Сталін у шынелі, у ботах, з картузом у левай руцэ, сканцэнтравана і натхнёна глядзіць наперад. Адчуваецца, што Сталін і вучань Леніна і ў той-жа час правадыр. Глядзіш на гэты вобраз, і ўспамінаеш выдатныя словы Анры Барбюса аб Сталіне, як аб чалавеку з галавой вучонага, у вопратцы простага салдата.

Застаецца пажадаць, каб Азгур і надалей упарта прадоўжваў гэтыя сюжэтныя і кампазіцыйныя пошукі, якія самі па сабе могуць значна дапамагчы яму канчаткова адмовіцца ад акадэмічных прынцыпаў партрэта, знайсці для вобразаў Леніна і Сталіна ўласцівыя ім веліч думкі і рэвалюцыйнага духу, іх прастату і чалавечнасць.

Заслугоўвае быць адзначанай і новая работа Азгура—бюст Леніна. Як нешматлікі ў нашай краіне скульптурныя работы, прысвечаныя Леніну, але з усіх гэтых работ можна вылучыць, бадай, толькі партрэты і кампазіцыі Андрэева і Меркурава, а таксама выдатную па свайму замыслу работу Піншчука, якая паказвае Леніна ў дні яго знаходжання ў Разліве, дзе ён хаваўся ад праследванняў Часовага ўрада. Усе гэтыя работы прадстаўлены ў музеі Леніна.

Андрэеў у сваіх работах імкнецца, галоўным чынам, перадаць не толькі гістарычную веліч ленінскага вобраза, але і яго выключную чалавечнасць, ад чаго накаторыя вобразы Леніна ў Андрэева здаюцца часам некалькі інтымнымі. Меркураў імкнецца выявіць у вобразе Леніна пераважна валявыя стораны ленінскага характару.

Не ў прыклад многім другім работам, Азгуру на гэты раз удалося авалодаць формаю, падпарадкаваць яе творчай задачы. Воблік Леніна распрацован з выключнай дасканаласцю, на гэты раз спрыяючы выяўленню галоўнага і характэрнага ў партрэце. Твар Ільіча напружаны, у вачах і дугах брывей, за неспакойнай паверхнасцю магутнага ілба адчуваецца велізарная мэтаімкнёная напружанасць ленінскага мозга і ў той-жа час воблік правадыра глыбока чалавечны.

Абрам Бразер у сваіх работах значна больш тэмпераментны за Азгура. Як тэхнік, ён слабей яго, але затое Бразер умее адухаўляць і саграваць вобраз цеплынёй свайго сэрца. Гэтымі якасцямі асабліва адрозніваецца апошняя новая работа Бразера—двухметравы бюст таварыша Сталіна, зроблены ім для беларускага павільёна на Усесаюзнай сельска-гаспадарчай выстаўцы.

У гэтым бюсце, праўда, ёсць пагрэшнасці ў прапорцыі і недасканалая трактоўка форм, але пры ўсім гэтым вобраз Сталіна здзіўляе велізарнай велічу і цеплынёй. У мастацтве, як гаварыў Родэн, бліскуча толькі галоўная і характэрнае. Гэтае галоўнае і характэрнае выяўлена Бразерам у партрэце Сталіна са значнай сілай. Адчуваецца іншы, чым у Азгура, творчы прыём, іншая, больш праўдзівая форма, падсказаная Бразеру глыбока прачутай ідэяй задуманага вобраза.

У гэтай рабоце Бразер зрабіў вялікі крок наперад, яна не можа нават ісці ў параўнанне з яго старымі, зусім неўдасканаленымі бюстамі Леніна і Сталіна, што ў Менскім Палацы піонераў. Будзем спадзявацца, што Бразер, улічыўшы ўсе ўрокі, упарта працуючы над формай, лепш справіцца з задуманай кампазіцыяй — вялікай скульптурнай фігурай Сталіна.

Мы свядома не спыніліся тут на разборы скульптурных работ на тэмы аб Леніне і Сталіне іншых беларускіх скульптараў, у прыватнасці, работ Керзіна, Бембеля і іншых у Доме Ўрада, паколькі скульптуры гэтыя характарызуюць ужо пройдзены нашымі скульптарамі творчы этап.

Беларускія жывапісцы і скульптары прарабілі вялікую і ўдзячную работу над вобразамі вялікіх правадыроў Леніна і Сталіна.

Совецкая Беларусь мае буйныя кадры мастакоў і скульптараў. Застаецца пажадаць, каб да 20-й гадавіны вызвалення Беларусі ад белапалякаў нашы беларускія мастакі прыйшлі з новымі, яшчэ больш яркімі творчымі работамі, раскрываючымі велізарную веліч вобразаў Леніна і Сталіна.

А. ДАЛІН.